# З НОВЫМ НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДАМ!




ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 24 (660) | Аўторак, 1 верасня 1987 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.


*СЁННЯ—ДЗЕНЬ ВЕДАЎ*

## СВЯТА МІЛЬЁНАЎ

**Б. В. БОКУЦЬ,**
**рэктар ГДУ, акадэмік АН БССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.**

Зноў за кніжкі брацца надышла пара...

Гэты радок з вядомага беларускага верша адклаўся ў нашай памяці з дзяцінства і нагадвае аб пачатку новага навучальнага года. Менавіта з першага вераснёўскага дня пачынаецца ўсеагульны паход за ведамі — агульнаадукацыйнымі, прафесіянальнымі, эканамічнымі і палітычнымі. За парты садзяцца многія дзесяткі мільёнаў савецкіх людзей — школьнікі, навучэнцы сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў, студэнты, слухачы розных форм марксісцка-ленінскай вучобы. І хоць дата 1 верасня ў календары не вызначана чырвоным колерам, тым не менш у гэты дзень усе мы адчуваем прыўзняты, святочны настрой. Гэта — Дзень ведаў, які ўжо на працягу некалькіх гадоў шырока адзначаецца па ўсёй нашай неабсяжнай краіне.

Веды — найвялікшае багацце кожнага народа. Толькі авалодаўшы імі, можна дасягнуць высокіх вынікаў ва ўсіх сферах сацыяльнага, эканамічнага і культурнага жыцця. Не выпадкова амаль кожны другі жыхар нашай краіны (не ўлічваючы дзяцей дашкольнага ўзросту) вучыцца ў той або іншай навучальнай установе, на курсах. Тут нельга не прывесці такія лічбы. На канец мінулага года 164 млн. савецкіх людзей мелі вышэйшую і сярэднюю (поўную і няпоўную) адукацыю. Сярод занятага насельніцтва гэты паказчык склаў 89%.

За перыяд з 1918 па 1986 год уключна вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы першай у свеце Краіны Саветаў падрыхтавалі 56 млн. спецыялістаў, у тым ліку 22 млн. — з вышэйшай адукацыяй. Цяпер кожны чацвёрты, заняты ў народнай гаспадарцы, мае вышэйшую або сярэднюю спецыяльную адукацыю.

На сённяшні дзень у нашай краіне налічваецца амаль 900 ВНУ і 4,5 тыс. тэхнікумаў, дзе навучаецца 9,6 млн. чалавек. Усе віды навучання ў СССР бясплатныя. За кошт дзяржавы забяспечваюцца падручнікамі вучні агульнаадукацыйных школ. У вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах даўно існуе сістэма стыпендыяльнага забеспячэння. У новым навучальным годзе партыяй і ўрадам прадугледжана павысіць стыпендыі, асабліва для тых, хто будзе мець высокую паспяховасць. Гэта — адзін з крокаў на шляху рэалізацыі пастаноў партыі і ўрада аб асноўных напрамках перабудовы вышэйшай школы.

У першавераснёўскі дзень савецкі народ асабліва глыбока адчувае значэнне велізарных перамен нашага сацыялістычнага ладу. За 70 гадоў пасля Вялікага Кастрычніка ў ходзе будаўніцтва новага грамадства ў СССР дасягнуты адзін з самых высокіх у свеце ўзроўняў адукаванасці мас. Удасканаленне народнай адукацыі — важнейшы клопат у дзейнасці Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада. На XXVII з'ездзе КПСС пастаўлена задача стварэння няспыннай адукацыі. У гэтай справе патрэбна вельмі многа зрабіць, каб ажыццявіць вызначаныя шырокамаштабныя мерапрыемствы. Агульнымі намаганнямі пастаўленая мэта будзе дасягнута.

У сістэме вышэйшай школы краіны дастойнае месца займае і наш універсітэт. За 18 гадоў існавання ў яго сценах на стацыянары і без адрыву ад вытворчасці падрыхтавана каля 19,5 тысячы высокакваліфікаваных спецыялістаў, якія працуюць у розных галінах народнай гаспадаркі як нашай вобласці і рэспублікі, так і далёка за іх межамі. Многія з выпускнікоў ГДУ сталі сапраўднымі спецыялістамі сваёй справы, папоўнілі рады вучоных.

Нядаўна ва універсітэце завяршыліся ўступныя экзамены. Прыемна ўсведамляць, што сёлета, як і ў папярэднія гады, недахопу на абітурыентаў не было ні на адну спецыяльнасць. На большасць з іх склалася адчувальная конкурсная канкурэнцыя. Права вучыцца ў вядучай вышэйшай навучальнай установе Беларускага Палесся атрымалі найбольш падрыхтаваныя выпускнікі агульнаадукацыйных школ, а таксама тыя юнакі і дзяўчаты, якія ўжо маюць пэўны працоўны і жыццёвы вопыт.

Напярэдадні слаўнага 70-годдзя Вялікага Кастрычніка каля 3,5 тысячы студэнтаў нашага універсітэта, у тым ліку 725 першакурснікаў, запоўняць аўдыторыі ГДУ. Ва ўрачыстай абстаноўцы пачнецца новы навучальны год. Прафесарска-выкладчыцкі састаў ставіць сваёй задачай яшчэ на больш высокі ўзровень узняць увесь вучэбна-выхаваўчы працэс, паставіць яго ў адпаведнасць з сучаснымі патрабаваннямі.

Ад імя рэктарата, партыйнай і грамадскіх арганізацый горача віншую ўвесь шматтысячны калектыў універсітэта з Днём ведаў, жадаю вам, дарагія таварышы, вялікіх поспехаў у вучобе, навуковай і выхаваўчай дзейнасці, у ажыццяўленні велічнай праграмы камуністычнага будаўніцтва.

## З УЗНАГАРОДАЙ!

За шматгадовую навуковую, педагагічную і грамадскую дзейнасць і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння прарэктар па вучэбнай рабоце нашага універсітэта член-карэспандэнт АН БССР **ШАМЯТКОЎ Леанід Аляксандравіч** узнагароджаны Ганаровай граматай абкома Кампартыі Беларусі і абласнога Савета народных дэпутатаў.

## НА ВЫСТАЎКАХ— ЭКСПАНАТЫ ГДУ

**У жніўні бягучага года на ВДНГ БССР была адкрыта экспазіцыя, прысвечаная 70-годдзю Вялікага Кастрычніка.** На ёе былі прадстаўлены чатыры экспанаты ад ГДУ. Сярод іх — стэнд для выпрабавання тарцовых зацвярдзенняў (макет), аўтарамі якога з'яўляюцца м. н. с. праблемнай навукова-даследчай лабараторыі М. І. Сінюк, м. н. с. А. Г. Лысееў, с. н. с. У. А. Замятнін, дацэнт кафедры фізікі цвёрдага цела І. М. Мельнічэнка; малагабарытнае прыстасаванне для вызначэння шурпатасці паверхні «Фатоніка-2» (м. н. с. лабараторыі «Сінтэз» В. А. Забаронскі, загадчык кафедры фізічнай метралогіі М. І. Аляшкевіч); дыскрэтны СВЧ фазавярчальнік-выключацель, дзесяціканальны СВЧ пераключацель, якія сканструявалі с. н. с. ГНДЛ У. Я. Скрэжэндзеўскі і м. н. с. А. В. Плавінскі.

Першы з названых экспанатаў быў прадстаўлены таксама на ВДНГ СССР.

Мінвуз СССР прымае ўдзел у нацыянальнай выстаўцы нашай краіны ў сталіцы Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам — г. Ханоі, якая адкрыецца ў лістападзе гэтага года. У адным з яе раздзелаў — «Вышэйшая адукацыя ў СССР» будзе прадстаўлен экспанат «Трэнажор для трэніроўкі стралка з лука» кандыдата педагагічных навук, загадчыка кафедры ТАФВ В. А. Баркова. А на выстаўцы «Навука, тэхніка і эканоміка БССР», якая праводзіцца ў Індыі, дэманструецца яшчэ адзін экспанат У. А. Баркова — трэнажор «Увага».

**Н. ПАЛЯКОВА,**
**інжынер службы НТІ НДС ГДУ.**

*Да вынікаў уступных экзаменаў*

## Першы крок да мары

Сёння ў наш універсітэт прыйдзе новае папаўненне. Гэта — 725 юнакоў і дзяўчат, якія найбольш паспяхова вытрымалі ўступныя экзамены і атрымалі права стаць студэнтамі ГДУ. Сярод паступіўшых у пераважнай большасці ўчарашнія выпускнікі агульнаадукацыйных сярэдніх школ. Нямала і тых, хто ўжо мае пэўны працоўны стаж, прайшоў службу ў радах Узброеных Сіл СССР.

Уступныя экзамены сёлета мелі сваю адметнасць. Адменена перадэкзаменацыйнае субяседванне, па выніках якога летась даваліся дадатковыя балы. У мінулым годзе яны былі налічаны 1102 з 1505 абітурыентаў. Заменен экзамен па грамадазнаўству.

У гэтым годзе план прыёму павялічыўся на 25 чалавек. Аднак прыток абітурыентаў знізіўся на 216 чалавек. Гэта тлумачыцца некалькімі прычынамі. Па-першае, пашырыўся прыём па мэтавых накіраваннях. Ён распаўсюджан не толькі на педагагічныя, але і некаторыя іншыя спецыяльнасці. Па-другое, вусны экзамен па матэматыцы быў заменены на пісьмовы. Для медалістаў на філагічныя спецыяльнасці стаў прафілюючым пісьмовы экзамен па літаратуры і мове. На аддзяленні «гісторыя» абітурыенты здавалі экзамен (у каго стаіць адзнака ў атэстаце) па беларускай мове і літаратуры, астатнія — па рускай мове і літаратуры.

Першымі ва універсітэт былі залічаны 55 слухачоў падрыхтоўчага аддзялення, якія паспяхова здалі выпускныя экзамены. На астатнія 670 месц прэтэндавала 1289 чалавек. Самым высокім быў конкурс на аддзяленне «гісторыя» — 3,85, на факультэт фізічнага выхавання — 3,7, на аддзяленне арганізацыі механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі — 2,4, на вытворчыя аддзяленні біялагічнага і матэматычнага факультэтаў — адпаведна 2,62 і 2,05. Самым нізкім быў конкурс на абодвух аддзяленнях фізічнага факультэта, педагагічным аддзяленні біяфака, на спецыяльнасць «інжынерная геалогія».

Сярэдні бал атэстатаў у абітурыентаў аказаўся некалькі ніжэйшым мінулагодняга. Праўда, гэта лічба яшчэ не дае поўнага ўяўлення аб якасці ведаў. Нават у асобных медалістаў яны аказаліся даволі слабымі. Аб гэтым сведчаць не толькі здавальняючыя адзнакі на экзаменах, але нават і «правалы». Спашлюся на прыклад. Адзін з медалістаў, які паступаў на матэматычны факультэт, у сачыненні зрабіў 30 памылак. Да гэтага факта, як кажуць, каментарыі не патрэбны. А такіх фактаў можна было б прывесці нямала, калі абітурыенты не апраўдвалі атрыманага медаля і па іншых дысцыплінах.

Ужо не першы год ажыццяўляецца рэформа агульнаадукацыйнай сярэдняй школы, аднак узровень ведаў выпускнікоў жадае быць значна вышэйшым. Уступныя экзамены ва універсітэт вытрымала ўсяго 817 абітурентаў—менш дзвюх трэціх. І толькі 200 — на «добра» і «выдатна». У працэнтных адносінах найбольшую колькасць нездавальняючых адзнак — ад 35 да 53% — атрымалі абітурыенты, якія паступалі на факультэт фізічнага выхавання, аддзяленні гісторыі, рускай мовы і літаратуры гістфіла, АМАЭІ.

Нельга не сказаць і аб тым, што ў многіх раёнах яшчэ выдаюць мэтавыя накіраванні для паступлення ў наш універсітэт асобам, узровень ведаў якіх далёка не адпавядае сучасным патрабаванням.

Прахадны бал вызначыўся па заканчэнні ўступных экзаменаў. Самым высокім ён аказаўся на аддзяленні «гісторыя» — 13. 12 балаў ён дасягнуў на факультэце фізічнага выхавання і вытворчым аддзяленні біяфака, 11 — на аддзяленні рускай мовы і літаратуры, педпатоку біяфака, вытворчым патоку матфака, аддзяленні АМАЭІ, педпатоку фізічнага факультэта. На ўсе астатнія спецыяльнасці прахаднымі былі 10 балаў. На 12 спецыяльнасцей з 14 была прынята некаторая колькасць абітурыентаў з паўпрахадным балам.

Думаецца, што факультэты і кафедры нашага універсітэта яшчэ не зусім актыўна вядуць работу па прафарыентацыі, як кажуць, не шукаюць «сваіх студэнтаў». У будучым яе трэба прыкметна ўзмацніць, зрабіць больш мэтанакіраванай. Справа не ў павелічэнні прытоку абітурыентаў, а ў тым, каб на вучобу ва універсітэт паступалі сапраўды падрыхтаваныя юнакі і дзяўчаты, зацікаўленыя ў выбраных спецыяльнасцях.

У заключэнне хочацца шчыра павіншаваць першакурснікаў з паступленнем на вучобу ў вядучую вышэйшую навучальную ўстанову Беларускага Палесся і пажадаць ім поспехаў у набыцці прафесіянальных ведаў і актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці, каб студэнцкія гады сталі сапраўды самымі памятнымі.

**С. ГОЛІК,**
**адказны сакратар прыёмнай камісіі, дацэнт.**

## *ВІНШУЕМ!*

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат і кафедры фізічнага факультэта горача віншуюць загадчыка кафедры оптыкі дацэнта СЕРДЗЮКОВА Анатоля Мікалаевіча з выпадку прысуджэння яму Вышэйшай Атэстацыйнай Камісіяй пры Савеце Міністраў СССР вучонай ступені доктара фізіка-матэматычных навук.**

* * *

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат фізічнага факультэта, кафедра метралогіі горача віншуюць кандыдата фізіка-матэматычных навук КАЗАКОВА Мікалая Паўлавіча з прысваеннем яму ВАКам вучонага звання дацэнт.**

* * *

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат гісторыка-філалагічнага факультэта, кафедра рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства горача віншуюць кандыдата філалагічных навук КОВАЛЯ Уладзіміра Іванавіча з прысваеннем яму Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР вучонага звання дацэнт.**

